**Сосна, К.** Ляцеў пад аблокамі «чорны» цюльпан / К. Сосна // Звязда. — 2014. — 8 лют. — С. 3.

## ЛЯЦЕЎ ПАД АБЛОКАМІ «ЧОРНЫ» ЦЮЛЬПАН

Леанід Сандзюк з вёскі Васюкі Шаркаўшчынскага раёна не вярнуўся з афганскай вайны, але бацька і сястра спадзяюцца, што знойдуцца яго саслужыўцы, тыя, хто ваяваў разам з ім ці проста ведаў хлопца.

Леанід Нарадзіўся і жыў у вёсцы Стуканы Глыбоцкага раёна, адтуль у сакавіку 1981 года яго прызвалі ў армію. Затым сям'я пераехала ў вёску Васюкі Шаркаўшчынскага раёна. Цяпер там жыве яго бацька Веньямін Паўлавіч з дачкой (маці памерла). У пакоі на відным месцы партрэт Леаніда, дзе ён навечна застаўся маладым.

– Спачатку сын служыў у Мар'інай Горцы, пасля трапіў у Туркменістан, а летам ён ужо быў у Афганістане, – распавёў Веньямін Паўлавіч. – У снежні сын пісаў: «Стаім высока ў гарах. Ахоўваем аб'ект. Відаць, тут і давядзецца сустракаць Новы Год». У студзені 1982-га ў Стуканы даляцела чарговая вестка: «Новы Год сустракалі без снегу, пры тэмпературы плюс 60 градусаў. Гэты год мне запомніцца на ўсё жыццё…» Чаму? Не напісаў, але маё сэрца адчувала, што недаслужыць ён…

У лютым таго ж года Леанід Сандзюк даслаў дадому яшчэ адзін ліст: «Знялі нас з гор. Жывём у палатках. Удзень плавімся ад спякоты, а ноччу мёрзнем». Затым настала цішыня… Начамі сын прыходзіў да бацькі ў снах…

– Аднаго дня іду з работы, – згадвае Веньямін Паўлавіч, – а насустрач жонка са слязамі: «Лёнечку забілі. Сыночка ў дамавіне вязуць». У той момант мне здалося, што зямля пад нагамі правалілася…

Пазней прыйшло паведамленне з часці. Камандзір пісаў, што Леанід Сандзюк загінуў, ратуючы сяброў і выносячы з полымя боепрыпасы. З кнігі «Памяць», экземпляр якой потым падораць бацьку, ён даведаўся, што сын быў цяжка паранены ў час артылерыйскага абстрэлу і памёр ад ран у шпіталі.

У мужчыны і па сённяшні дзень жыве боль, востры, нясцерпны. Веньямін Сандзюк спрабаваў знайсці тых, хто служыў разам з Леанідам, праз раённую газету, але не атрымалася. Тым не менш бацька не губляе надзею, што ў Беларусі ці іншых краінах былога Савецкага Саюза жывуць «афганцы», якія ваявалі поплеч з Леанідам, і просіць іх адклікнуцца.

**Кацярына СОСНА**